БАЖ – гэта
пра медыя,
baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ
## Ў БЕЛАРУСІ

№1 (82)
2026



Галоўная рэдактарка TUT. BY Марына Золатава з дзяцьмі і мужам, 18 снежня 2025 года, Варшава, Польшча. Фота: «Люстэрка»

2 | СМІ ў Беларусі ў кастрычніку — снежні 2025 года. Агляд

8 | Лічбы года — 2025

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАСТРЫЧНІКУ — СНЕЖНІ 2025 ГОДА. АГЛЯД

**Напрыканцы 2025 года рэпрэсіўная палітыка ў дачыненні да прадстаўнікоў СМІ працягвалася:**

- **ажыццяўляўся крымінальны пераслед незалежных журналістаў і блогераў** унутры краіны і тых, хто крытычна выказваецца адносна сітуацыі ў Беларусі з замежжа, — былі вынесеныя 5 прысудаў у дачыненні да журналістаў і 3 прысуды ў дачыненні да блогераў;
- дзейнічала цэнзура ў яе разнастайных праявах, у прыватнасці, **2 медыяпраекты былі прызнаныя «экстрэмісцкімі фармаваннямі», а 7 журналістаў — «экстрэмістамі»**;
- **у беларускіх уладаў атрымалася адабраць даменнае імя, зарэгістраванае замежнай кампаніяй**, — гэта euroradio.by і «Еўрарадыё»;
- стала вядома пра **жорсткі ціск на некаторых палітзняволеных за тое, што пра іх пішуць незалежныя СМІ**, што можна лічыць спецыфічнай праявай цэнзуры;
- побач з цэнзурай неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі ў інфармацыйнай сферы заставаліся афіцыйная прапаганда і дыскрэдытацыя апанентаў. **Вынікі адмысловага даследавання сведчаць пра наяўнасць «трэнду лічбавага аўтарытарызму» —**

перанасычэнне інфармацыйнага поля падкантрольнымі наратывамі.

Разам з тым адбылося самае масавае вызваленне беларускіх палітзняволеных (123 чалавекі) як вынік перамоў амерыканскай дэлегацыі на чале з прадстаўніком прэзідэнта ЗША Джонам Коўлам з афіцыйным Мінскам. Сярод вызваленых — галоўная рэдактарка *ліквідаванага* ўладамі інфармацыйнага партала TUT.BY **Марына Золатава**, якая правяла ў зняволенні чатыры з паловай гады, а таксама сябры БАЖ **Алесь Бяляцкі** (лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру) і *Аляксандр Фядута*. Усе вызваленыя былі прымусова дэпартаваныя з Беларусі.

Паводле звестак БАЖ, на 31 снежня 2025 года ў Беларусі ў зняволенні *заставаліся* 28 супрацоўнікаў медыя.

## Крымінальны пераслед. Затрыманні ў Беларусі

На працягу апошніх трох месяцаў 2025 года былі вынесеныя **5 прысудаў у дачыненні да журналістаў** у Беларусі. Таксама былі асуджаныя **3 блогеры**. **Былі распачатыя як найменш 3 крымінальныя справы** ў дачыненні да супрацоўнікаў медыя.

31 кастрычніка рэдактара гродзенскага навінавага партала з 19-гадовай гісторыяй, s13.ru, **Сяргея Чабоцьку** *асудзілі* на 3,5 гады пазбаўлення волі з адбыццём у калоніі ўзмоцненага рэжыму (да суда яго ўтрымлівалі за кратамі больш за год). Рэдактара абвінавацілі ў «экстрэмізме» і «паклёпе» на Аляксандра Лукашэнку.

Стала вядома пра вынясенне прысуду паводле артыкула 361-4 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці) чатыром супрацоўнікам баранавіцкага навінавага рэсурсу BAR24, створанага камандай колішняга незалежнага рэгіянальнага выдання Intex-Press, які мусіў спрыніць існаванне з прычыны прызнання ўладамі «экстрэмісцкім». **Наталля Семяновіч**, **Мікіта Пятроўскі**, **Руслан Равяка** і **Людміла Зелянькова** *атрымалі* пакаранне ў выглядзе абмежавання волі.

**Яўген Старавойтаў** з Клічава — краязнаўца і стваральнік блога «Магілёўскія хронікі» — *правёў* больш за тры месяцы ў следчым ізалятары і быў вызвалены з-пад варты на пачатку верасня пасля прысуду да абмежавання волі паводле артыкула 361-4 Крымінальнага кодэкса (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці).



Караліна Кананові. Фота: ilinterviews.com

5 кастрычніка відэаблогерка **Караліна Кананові** *паведаміла* пра асуджэнне яе да 2,5 гадоў абмежавання волі паводле артыкула 342 Крымінальнага кодэкса (актыўны ўдзел у дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак): яна была затрыманая ў час прыезду ў Мінск з Амстэрдама і правяла ў зняволенні да суда 4 месяцы. Пасля прысуду блогерка з’ехала з Беларусі.

11 лістапада мазырскага відэаблогера **Максіма Шуканава** (YouTube-канал Union Bell), які асвятляў палітычныя тэмы і вайну ва Украіне, *асудзілі* да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбыццём у калоніі. Да лютага 2025 года ён знаходзіўся на нелегальным становішчы. Пасля арышту

яго бацькі Максім быў вымушаны звярнуцца па медыцынскую дапамогу і быў затрыманы разам са сваёй нявестай Палінай Зыль (асуджаная ў ліпені да 1 года зняволення).

Стала вядома, што журналіст **Павел Дабравольскі**, які ўтрымліваецца ў следчым ізалятары КДБ са студзеня 2025 года, *абвінавачваецца* ў «здрадзе дзяржаве» (артыкул 356 Крымінальнага кодэкса). Як паведамляецца, крымінальны пераслед распачаты ў сувязі з яго прафесійнай дзейнасцю (раней ён працаваў як на беларускія, так і на замежныя СМІ, у тым ліку на ўкраінскі часопіс NV.ua). Журналісту пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.


Таццяна Ашуркевіч

Былі ўзбуджаныя крымінальныя справы ў дачыненні да журналістак-эмігрантак **Ірыны Халіп**, якая працуе карэспандэнткай анлайн-выдання «Новая газета Европа» (да яе бацькоў у Мінску 27 лістапада *прыходзілі* зператрусам сілавікі) і **Таццяны Ашуркевіч** (звесткі пра яе *з'явіліся* ў базе крымінальнага вышуку на тэрыторыі Расіі і Беларусі).

Вызвалены праваабаронца **Уладзімір Лабковіч**, распавядаючы, што ўмовы, у якіх знаходзіліся палітычныя вязні, з'яўляюцца катаваннямі ва ўсіх сэнсах, *адзначыў*, што адміністрацыя папраўчай калоніі папярэджвала, што згадкі яго імя ў замежнай прэсе будуць разглядацца як прычына для ўзмацнення ціску.У прыватнасці, для змяшчэння ў штрафны ізалятар з жорсткімі ўмовамі ўтрымання. Гэта можна лічыць яшчэ адной спецыфічнай праявай цэнзуры з боку дзяржаўных уладаў.

# Выкарыстанне антыэкстрэмісцкага заканадаўства супраць медыя, іншыя формы ціску

Працягвалася прызнанне беларускіх медыйных праектаў **«экстрэмісцкімі фармаваннямі»**: такімі былі абвешчаныя аўтарскае медыя *Plan B* і інтэрнэт-радыёстанцыя *Radio Plato*.

Як і раней, **Міністэрства інфармацыі ў вялікай колькасці дадавала (па выніках судовых рашэнняў) акаўнты медыйных праектаў і медыядзеячаў у Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў**. Так, напрыклад, туды ўвайшлі суполка «Еврорадио-Новости Беларуси» ў сацыяльнай сетцы «Одноклассники», акаўнт анлайн-выдання «Зеркало» ў Threads, YouTube-канал «Жизнь-малина» блогера Мікіты Мелказёрава і інш.

Семярых асуджаных журналістаў — **Алега Супрунюка** з Брэста, **Сяргея Чабоцьку** з Гродна, **Ігара Ільяша** з Мінска, баранавіцкіх **Наталлю Семяновіч**, **Мікіту Пятроўскага**, **Руслана Равяку** і **Людмілу Зелянькову** — унеслі ў лік асоб датычных да экстрэмісцкай дзейнасці паводле адпаведнага рашэння Міністэрства ўнутраных спраў.


Фота: pixabay.com

У працяг практыкі, распачатай з 2024 года, па пазбаўленні даменных імёнаў тых медыярэсурсаў, што былі ўнесеныя ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, **у беларускіх уладаў** *атрымалася адабраць* **у «Еўрарадыё» даменнае імя з адрасам euroradio.by, якое было зарэгістраванае аўстралійскай кампаніяй** Europe

Registry ў 2009 годзе. Гэта сталася першым падобным выпадкам, бо раней адабранне тычылася толькі тых адрасоў, што былі зарэгістраваныя ў Беларусі.

Разам з цэнзурай прапаганда і дыскрэдытацыя апанентаў заставаліся неад’емнай часткай дзяржаўнай палітыкі ў інфармацыйнай сферы.



9 снежня дырэктаркай Цэнтра новых ідэй Лесяй Руднік былі прэзентаваныя вынікі *даследавання* **«Мэпінг беларускай прапаганды: пра што і як пішуць беларускія праўладныя аўтары?»**. У ім *адзначаецца*, што пасля пратэстаў 2020 года ўлады пачалі актыўна прасоўваць сваю павестку ў Telegram: дзясяткі праўладных каналаў у месенджары штодня публікуюць тысячы аднатыпных пастоў у падтрымку ўладаў і асабіста Лукашэнкі, адначасова крытыкуючы яго апанентаў. Усе гэта адбываецца на фоне блакіроўкі доступу да альтэрнатыўнай інфармацыі і стыгматызацыі незалежных СМІ. Тым не менш, аўдыторыя не вельмі актыўна адгукаецца на праўладны кантэнт. Такая стратэгія адлюстроўвае трэнд лічбавага аўтарытарызму: кантроль ажыццяўляецца не столькі праз цэнзуру, колькі праз перанасычэнне інфармацыйнага поля падкантрольнымі наратывамі.

# ЛІЧБЫ ГОДА — 2025

Беларуская асацыяцыя журналістаў сабрала статыстыку па рэпрэсіях у галіне ў 2025 годзе. А таксама зрабіла асобную аналітыку па пазітыўных падзях у медыясектары:

- 28 прадстаўнікоў і прадстаўніц медыя за кратамі.
- 34 ператрусы і агляды памяшканняў за год.
- 12 затрыманняў за год.
- 42 медыяў прызнаныя «экстрэміcцкімі фармаваннямі».
- Больш за 100 выпадкаў завочнага пераследу журналістаў.
- 26 медыя і арганізацый *далучыліся* да Кодэкса этыкі беларускіх журналістаў і сістэмы самарэгулявання.
- 62 калегі *скончылі* Журфак па суботах у Вільні і Варшаве.
- 15 акцый салідарнасці з беларускімі журналістамі прайшлі па ўсім свеце.

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ
СМІ
Ў БЕЛАРУСІ
№1 (82) 2026

# ЛІЧБЫ ГОДА-2025

Беларускі медыясектар у лічбах

**28** прадстаўнікоў і прадстаўніц медыя за кратамі

**12** затрыманняў за год

**42** медыяў прызнаныя «экстрэмісцкімі фармаваннямі»

**34**ператрусы і агляды памяшканняў за год

**>100** выпадкаў завочнага перасведу журналістаў

Беларуская асацыяцыя журналістаў | www.baj.media

# ЛІЧБЫ ГОДА-2025

Беларускі медыясектар у лічбах

**26** медыя і арганізацый далучыліся да Кодэкса этыкі беларускіх журналістаў і сістэмы самарэгулявання

**62** калегі скончылі Журфак па суботах у Вільні і Варшаве

**15** акцый салідарнасці з беларускімі журналістамі прайшлі па ўсім свеце

Беларуская асацыяцыя журналістаў | www.baj.media

БАЖ

БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Андрэй Бастунец

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media/be